# НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ІДЭНТЫЧНАСЦЬ БЕЛАРУСАЎ

## І частка даследавання

30 чэрвеня 2020

Даследаванне праведзена кампаніяй SATIO Powered by CIVITTA



# ПЛАН ПРЭЗЕНТАЦЫІ

- МЕТАДАЛОГІЯ
- СЕГМЕНТАЦЫЯ ГРАМАДСТВА
- КАШТОЎНАСЦІ, ЯКІЯ АБ’ЯДНОЎВАЮЦЬ
- САЛІДАРНАСЦЬ І ГРАМАДСКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ
- УДЗЕЛ У ГРАМАДСКІХ АРГАНІЗАЦЫЯХ
- НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ І ПАГРОЗА ЯЕ СТРАТЫ

# МЕТАДАЛОГІЯ І СЕГМЕНТАЦЫЯ

Даследаванне праведзена кампаніяй SATIO Powered by CIVITTA

# МЕТАДАЛОГІЯ

### МЕТАДАЛОГІЯ ДАСЛЕДАВАННЯ
Online-апытанне (CAWI)

### АБ'ЁМ ВЫБАРКІ
1589

### ГЕАГРАФІЯ
Гарады Беларусі

### ПАТРАБАВАННІ ДА РЭСПАНДЭНТАЎ
Больш за 18 год

### ТЭРМІНЫ ПРАВЯДЗЕННЯ АПЫТАННЯ
8-20 траўня 2020

# ГРУПЫ АТРЫБУТАЎ, ЯКІЯ ВЫЗНАЧАЮЦЬ СТАЎЛЕННЕ ДА НАЦЫЯНАЛЬНЫХ КАШТОЎНАСЦЯЎ

## БЕЛАРУСКАЯ

*жадаю больш беларускага ў жыцці*

- Жадаю больш беларускай мовы ў жыцці
- Жадаю больш беларускай мовы на тэлебачанні і радыё
- У навучальных установах павінна быць больш прадметаў на беларускай мове
- Перайшоў бы на беларускую мову, калі б навокал мяне было больш людзей, якія размаўляюць па-беларуску
- Многія праблемы краіны звязаны з тым, што мы забыліся сваю культуру і мову

## РАСІЙСКА-САВЕЦКАЯ

*сумую па СССР, няма прыцяснення беларускага*

- Распад Савецкага Саюзу – вялікая трагедыя
- Нам не варта пазбаўляцца ад савецкай спадчыны
- Калі прыйшлося б выбіраць, куды іміграваць – у Расію ці ў Заходнюю Еўропу – я б выбраў Расію

## КАСМАПАЛІТЫЧНАЯ

*нацыянальнае – лішні бар'ер, культура не вельмі важна*

- Нацыянальная культура і патрыятызм ствараюць лішнія бар'еры паміж людзьмі
- Талерантнасць – хутчэй загана беларусаў, чым станоўчая рыса
- Не думаю, што ў сучасным свеце нацыянальная культура і мова важныя

# БЕЛАРУСКАЕ ГРАМАДСТВА СЕГМЕНТАВАНАЕ ПАВОДЛЕ АДНОСІНАЎ ДА НАЦЫЯНАЛЬНАГА

## 11% — Свядомыя

- Надзвычай высокая праява беларускага
- Руска-савецкае надзвычай нехарактэрна
- Касмапалітычнае даволі нехарактэрна

## 25% — Абыякавыя

- Беларускае даволі нехарактэрна
- Сярэдні ўзровень стаўлення да расійска-савецкага
- Касмапалітычнае хутчэй характэрна

## 34% — Савецкія

- Беларускае даволі нехарактэрна
- Надзвычай высокае праяўленне расійска-савецкага
- Касмапалітычнае хутчэй характэрна

## 30% — Канформныя

- Беларускае хутчэй характэрна
- Расійска-савецкае даволі нехарактэрна
- Касмапалітычнае даволі нехарактэрна

# СТАЎЛЕННЕ ДА НАЦЫЯНАЛЬНАГА Ў РОЗНЫХ ГРУПАЎ ПРАЯЎЛЯЕЦЦА ПА-РОЗНАМУ




**XX%** - доля сярод беларусаў

# СЕГМЕНТЫ АДРОЗНІВАЮЦЦА САЦЫЯДЭМАГРАФІЧНА

| Сегмент | СВЯДОМЫЯ | САВЕЦКІЯ | АБЫЯКАВЫЯ | КАНФОРМНЫЯ |
|---|---|---|---|---|
| Доля | 11% | 34% | 25% | 30% |
| Пол і ўзрост | Значна больш мужчын, менш моладзі | Пол – 50/50, менш моладзі, больш 45+ | Значна больш жанчын, больш моладзі, менш 45+ | Значна больш жанчын, больш моладзі, менш 45+ |
| Адукацыя | Часцей* маюць вышэйшую адукацыю, гуманітарную, радзей – сярэднюю спецыяльную ці праф. | Часцей маюць агульную ці сярэднюю спец./праф. адукацыю, тэхнічную | Менш адукаваныя за канформных і свядомых, больш за савецкіх, часцей маюць эканамічны профіль | Часцей маюць вышэйшую адукацыю, прыродазнаўчую ці гуманітарную, радзей – сярэднюю, тэхнічную |
| Прыбыткі | Найвышэйшы прыбытак | Найніжэйшы прыбытак | Найніжэйшы прыбытак | Сярэдні прыбытак |
| Сям’я | Часцей жывуць асобна, радзей маюць дзяцей | Часцей жывуць ў вялікіх сем’ях і жанаты, маюць больш дзяцей | Часцей жывуць з бацькамі | Сярэдні ўзровень |
| Рэгіён | Больш мінчукоў, менш з вялікіх гарадоў і Гомельскай вобласці | Часцей з Гомельскай вобласці і вялікіх гарадоў, радзей з Мінску | Часцей з Віцебскай і Гомельскай абласцяў, вялікіх гарадоў | Часцей з Гродзенскай вобласці і Мінску, радзей з Віцебскай, Гомельскай, вялікіх гарадоў |
| Прафесія | Часцей з айці-сектара, кваліфікаваныя адмыслоўцы ці менеджары, радзей з сельскай гаспадаркі | Часцей працуюць рабочымі, прадаўцамі, у ўзброеных сілах і будаўніцтве, ці пенсіянеры, радзей – у айці | Часцей беспрацоўныя ці працуюць у гандлі | Часцей з айці-сектара ці сферы адукацыі, здароўя і культуры, кваліфікаваныя адмыслоўцы ці менеджары |

*часцей азначае большую долю адносна іншых сегментаў, а не абсалютную большасць

# КАШТОЎНАСЦІ БЕЛАРУСАЎ

Даследаванне праведзена кампаніяй SATIO Powered by CIVITTA

# ВЯРШЭНСТВА ЗАКОНУ, СВАБОДНЫЯ ВЫБАРЫ І АСАБІСТАЯ СВАБОДА – НАЙВАЖНЕЙШЫЯ КАШТОЎНАСЦІ, АДНОСНА ІНШЫХ

**ВАЖНАСЦЬ КАШТОЎНАСЦІ**

*= найважнейшыя каштоўнасці для мяне + для іншых беларусаў*

- Роўнасць усіх перад законам
- Свабодныя выбары
- Свабода і асабістая недатыкальнасць
- Сумленны, адкрыты і справядлівы суд
- Свабода думак і перакананняў
- Свабода слова
- Свабодны доступ да інфармацыі
- Роўнасць магчымасцяў
- Свабода, сходаў, мітынгаў, асацыяцыяў
- Карыстанне роднай мовай

Крыніца: адказы на пытанні «Каторыя з пералічаных каштоўнасцяў маюць для ВАС найбольшую важнасць? Для іншых? Выберыце 3 самыя важныя.

# НА ДУМКУ БАЛЬШЫНІ, ДЭМАКРАТЫЧНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ НЕ ЗАБЯСПЕЧВАЮЦЦА

**ЗАХАВАННЕ ПРАВОЎ У БЕЛАРУСІ**, n=1589




1 – важнасць каштоўнасці суадносіцца з адказамі па каштоўнасці «Максімальна выкарыстаць свае здольнасці і магчымасці»



Крыніца: У якой ступені наступныя каштоўнасці захоўваюцца або не захоўваюцца ў Беларусі?

# «СВЯДОМЫЯ» НАЙБОЛЬШ НЕЗАДАВОЛЕНЫЯ СІТУАЦЫЯЙ СА СВАБОДАМІ. «САВЕЦКІЯ» — НАЙМЕНШ

## ДОЛЯ ЗГОДНЫХ, ШТО КАШТОЎНАСЦЬ У БЕЛАРУСІ НЕ ЗАХОЎВАЕЦЦА, ПА СЕГМЕНТАХ




1 – важнасць каштоўнасці суадносіцца з адказамі па каштоўнасці «Максімальна выкарыстаць свае здольнасці і магчымасці»

# СВЯТЫ І ТЫПОВЫЯ РЫСЫ БЕЛАРУСАЎ

годна

БУДЗЬМА БЕЛАРУСАМІ!

Даследаванне праведзена кампаніяй

SATIO
Powered by CIVITTA

# БЕЛАРУСЫ АСАЦЫЮЮЦЬ СЯБЕ З ПРАЦАВІТАСЦЮ, ПРЫЯЗНАСЦЮ ДЫ ПАМЯРКОЎНАСЦЮ

**ВОБЛАКА ХАРАКТАРЫСТЫК БЕЛАРУСА**




■ Пазітыўнае

■ Негатыўнае

■ Нейтральнае

# ГАЛОЎНАЕ СВЯТА – ДЗЕНЬ РЭСПУБЛІКІ (ПРАЗ СУВЯЗЬ З НЕЗАЛЕЖНАСЦЮ)

n Свядомыя = 175, Савецкія = 541,
Абыякавыя = 404, Канформныя = 469

## ГАЛОЎНАЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЕ СВЯТА БЕЛАРУСІ, n=1589 / СВЯТА, ЯКОЕ ПАВІННА СТАЦЬ ГАЛОЎНЫМ, ПА СЕГМЕНТАХ

| | Зараз | Павінна стаць | Свядомыя | Савецкія | Абыякавыя | Канформныя |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Новы год (1 студзеня) | 14% | 7% | 1% | 6% | 14% | 4% |
| Дзень Волі (25 сакавіка) | 6% | 8% | 39% | 2% | 2% | 10% |
| Дзень Перамогі (9 мая) | 30% | 21% | 5% | 29% | 23% | 14% |
| Дзень Незалежнасці (Рэспублікі, 3 ліпеня) | 39% | 42% | 14% | 47% | 40% | 48% |
| Дзень абвяшчэння незалежнасці ад СССР (27 ліпеня) | 3% | 6% | 19% | 1% | 5% | 9% |
| Дзень, калі дэкларацыя незалежнасці набыла канстытуцыйны статус (25 жніўня) | 2% | 4% | 14% | 2% | 2% | 4% |
| Раства (25 снежня/7 студзеня) | 4% | 4% | 5% | 5% | 4% | 3% |



Крыніца: На Вашу думку, якое зараз галоўнае нацыянальнае свята Беларусі?, На Ваш погляд, каторы дзень павінен стаць галоўным нацыянальным святам Беларусі?

# САЛІДАРНАСЦЬ І ГРАМАДСКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

Даследаванне праведзена кампаніяй

- **АСНОЎНЫЯ БАР’ЕРЫ ДЛЯ САЛІДАРНАСЦІ І АКТЫЎНАСЦІ – ПАЧУЦЦЁ БЕССЭНСОЎНАСЦІ, ПАМНОЖАНАЕ НА СТРАХ ПАКАРАННЯ**
- **ПРЫ ГЭТЫМ БЕЛАРУСЫ СТАНОЎЧА СТАВЯЦЦА ДА ПРАЯВАЎ ГРАМАДСКАЙ ПАЗІЦЫІ І САЛІДАРНАСЦІ**
- **У НЕКАТОРЫХ ВЫПАДКАХ САЛІДАРНАСЦЬ УСПРЫМАЕЦЦА, ЯК НЕАБХОДНАСЦЬ**

# БЕЛАРУСЫ РАЗУМЕЮЦЬ НЕАБХОДНАСЦЬ САЛІДАРНАСЦІ

**Малады чалавек пабачыў, што сяброўка пералічвае грошы для супрацоўнікаў шпіталяў, заангажаваных у барацьбу з каранавірусам. Ён спытаў у яе, чаму яна гэта робіць. Дзяўчына адказала, што робіць гэта, бо ...**



# ДАБРАЧЫННАСЦЬ ВЫКЛІКАЕ СТАНОЎЧУЮ РЭАКЦЫЮ

**Бізнесовец пералічыў немалыя грошы на барацьбу з каранавірусам. Яго знаёмыя даведаліся пра гэта, і адзін з іх спытаў у другога: «Як ты думаеш, чаму ён гэта зрабіў?» У адказ ён пачуў: «Я думаю, ён гэта зрабіў, бо ...»**



# ПРАЯВЫ СВАЁЙ ПАЗІЦЫІ ВЫКЛІКАЮЦЬ ПАЗІТЫЎНЫЯ ПАЧУЦЦІ

**Дзве дзяўчыны выпівалі ў бары. У бар увайшоў малады чалавек у майцы з БЧБ і «Пагоняй». Адна дзяўчына сказала іншай: «Гэты хлопец такі ...»**




Крыніца: Працягніце выказванне

# СТРАХ І ЗНЯВЕРАНАСЦЬ СТРЫМЛІВАЮЦЬ БЕЛАРУСАЎ АД УДЗЕЛУ Ў ГРАМАДСКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

**«Чаму ты не уступіш у арганізацыю або хаця б не падтрымаеш яе, у цябе ж такія ж погляды?» і пачуў у адказ:
«Я гэтага не раблю, таму што ...»**



# СТРАХ І ЗНЯВЕРАНАСЦЬ СТРЫМЛІВАЮЦЬ БЕЛАРУСАЎ АД УДЗЕЛУ Ў ГРАМАДСКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

**«Чаму ты не хочаш напісаць куды-небудзь скаргу на паліклініку?» Яна адказала: «Я не хачу нікуды звяртацца, таму што ... »**



годна

БУДЗЬМА БЕЛАРУСАМІ!

Даследаванне праведзена кампаніяй

SATIO
Powered by CIVITTA

# ГРАМАДСКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ

# СЯРОД ГРАМАДСКІХ АРГАНІЗАЦЫЯЎ, БЕЛАРУСЫ НАЙЧАСЦЕЙ НАЗЫВАЮЦЬ БРСМ, БНФ, БЕЛАЯ РУСЬ, МОВА НАНОВА, SYMBAL.BY

**СПАНТАННАЕ ВЕДАННЕ ГРАМАДСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ, ПРАСОЎВАЮЧЫХ НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ, n=1589**

(Чым буйнейшы надпіс, тым часцей згадваецца, большая частка – 1 раз)



# З НЕДЗЯРЖАЎНЫХ АРГАНІЗАЦЫЯЎ НАЙПЕРШ ПАЗНАЮЦЬ МАЛАДЫ ФРОНТ, МКБ, І РУХ ЗА СВАБОДУ

**ПАЗНАВАЛЬНАСЦЬ ГРАМАДСКІХ ІНІЦЫЯТЫВАЎ, КАМПАНІЙ І АРГАНІЗАЦЫЙ**
**З ПАДКАЗКАЙ, n=1589**



# ДЗЯРЖАЎНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ ЎСПРЫМАЮЦЬ ЯК “НЯВАЖНЫЯ” І “НЕПАТРЭБНЫЯ”

## МАПА ЎСПРЫМАННЯ ІМІДЖУ




1 – спрыяюць папулярызацыі мовы/культуры

2 – існуюць толькі асабістых інтарэсаў ўдзельнікаў
3 – дзейнасць для насельніцтва не важная
4 – не прыносяць ні шкоды, ні карысці
5 – не даюць рады са сваімі мэтамі

6 – распаўсюджваюць сярод насельніцтва нездаровыя нацыяналістычныя ідэі

7 – спрыяюць праяўленню грамадскай ініцыятывы
8 – спрыяюць вырашэнню вострасацыяльных праблемаў
9 – незалежны грамадскі кантроль над дзейнасцю дзяржаўных органаў

10 – з’яўляюцца праваднікамі замежных каштоўнасцяў і ідэй

# ТОЛЬКІ 10% УДЗЕЛЬНІЧАЮЦЬ У ГРАМАДСКІХ АРГАНІЗАЦЫЯХ

n Свядомыя = 175, Савецкія = 541, Абыякавыя = 404, Канформныя = 469

## ДОЛЯ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ ГРАМАДСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ ПА СЕГМЕНТАХ




## ПРЫЧЫНЫ НЯЎДЗЕЛУ Ў ГРАМАДСКІХ АРГАНІЗАЦЫЯХ, n=1433






Крыніца: Ці з'яўляецеся Вы сябрам грамадскіх арганізацыяў/кампаній/ініцыятываў, прасоўваючых беларускія каштоўнасці і культуру?, Што ёсць прычынай таго, што Вы не з'яўляецеся сябрам грамадскіх арганізацыяў/кампаній/ініцыятывыў, прасоўваючых беларускія каштоўнасці і культуру?

Даследаванне праведзена кампаніяй

# ПАГРОЗА НЕЗАЛЕЖНАСЦІ І ІНТЭГРАЦЫЯ З РАСІЯЙ

# У ГРАМАДСКАЙ СВЯДОМАСЦІ: СТРАТА НЕЗАЛЕЖНАСЦІ — КЕПСКА

**У навінах паведамілі, што інтэграцыя РБ і РФ будзе паглыблена. Сусед нецэнзурна вылаяўся і сказаў: «Я не хачу інтэграцыі, таму што ...»**



# БЕЛАРУСЫ ЦЭНЯЦЬ ДЗЯРЖАЎНАСЦЬ І НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ

**СТАЎЛЕННЕ БЕЛАРУСАЎ ДА ІНТЭГРАЦЫІ**, n=1589

| АРГУМЕНТЫ СУПРАЦЬ ІНТЭГРАЦЫІ | ЗГОДНЫ | НЕ ЗГОДНЫ |
|---|---|---|
| Інтэграцыя зруйнуе беларускую дзяржаўнасць | 56% | 23% |
| Як народ можна выжыць толькі ў цалкам незалежнай дзяржаве | 55% | 25% |
| Інтэграцыя пагоршыць сітуацыю з карупцыяй у Беларусі | 54% | 19% |
| Незалежнасць Беларусі – найважнейшае дасягненне апошніх 30 гадоў | 52% | 22% |
| Расія занадта вялікая; у маленькай краіне жывецца лепей | 52% | 24% |
| Мне падабаецца мова і культура, ў адзінай дзяржаве яны загінуць | 49% | 33% |
| Калі Беларусь і Расія інтэгруюцца, становішча Беларусі на міжнароднай арэне пагоршыцца | 41% | 30% |
| Якасць беларускіх тавараў пагоршыцца ў выпадку інтэграцыі | 38% | 38% |
| У Расіі занадта шмат народаў, не падобных на беларусаў; не хацелася б з імі «аб'ядноўвацца» | 35% | 37% |

| АРГУМЕНТЫ ЗА ІНТЭГРАЦЫЮ | ЗГОДНЫ | НЕ ЗГОДНЫ |
|---|---|---|
| Нічога не зменіцца – Беларусь і так залежыць ад Расіі | 38% | 36% |
| Інтэграцыя палепшыць эканамічнае становішча беларускіх прадпрыемстваў | 34% | 38% |
| Гэта гістарычная непазбежнасць і прызначэнне двух народаў | 28% | 43% |
| Інтэграцыя палепшыць жыццё звычайных беларусаў | 25% | 46% |
| Па-сапраўднаму незалежнай Беларусь можа стаць толькі ў саюзе | 19% | 54% |
| Беларусь – адсталая краіна; інтэграцыя – шлях у клуб «нармальных» краін | 15% | 63% |
| Пасля інтэграцыі у Беларусі нарэшце будзе парадак | 12% | 61% |

Крыніца: Апошнім часам абмяркоўваецца пытанне аб інтэграцыі Беларусі і Расіі. Скажыце, ці вы згодны ці не згодны з наступнымі выказваннямі?

# СВЯДОМЫЯ ДЫ КАНФОРМНЫЯ СТАВЯЦЦА ДА ІНТЭГРАЦЫІ БОЛЕЙ НЕГАТЫЎНА, А САВЕЦКІЯ ДЫ АБЫЯКАВЫЯ – БОЛЬШ ПАЗІТЫЎНА

## ЗГОДА З ВЫКАЗВАННЯМІ ПА СЕГМЕНТАХ

- Свядомыя | n=175
- Савецкія | n=541
- Абыякавыя | n=404
- Канформныя | n=469
- Сярэднее | n=1589

### АРГУМЕНТЫ СУПРАЦЬ ІНТЭГРАЦЫІ

Інтэграцыя зруйнуе беларускую дзяржаўнасць

Як народ, можна выжыць толькі ў цалкам незалежнай дзяржаве

Інтэграцыя пагоршыць сітуацыю з карупцыяй у Беларусі

Незалежнасць Беларусі – найважнейшае дасягненне апошніх 30 гадоў

Расія занадта вялікая; у маленькай краіне жывецца лепей

Мне падабаецца беларуская мова і культура, а ў адзінай дзяржаве яны загінуць

Калі Беларусь і Расія інтэгруюцца, становішча Беларусі на міжнароднай арэне пагоршыцца

Якасць беларускіх тавараў пагоршыцца ў выпадку інтэграцыі

У Расіі занадта шмат народаў, не падобных на беларусаў; не хацелася б з імі «аб'ядноўвацца»




### АРГУМЕНТЫ ЗА ІНТЭГРАЦЫЮ

Нічога не зменіцца – Беларусь і так залежыць ад Расіі

Інтэграцыя палепшыць эканамічнае становішча беларускіх прадпрыемстваў

Гэта гістарычная непазбежнасць і прызначэнне двух народаў

Інтэграцыя палепшыць жыццё звычайных беларусаў

Па-сапраўднаму незалежнай Беларусь можа стаць толькі ў саюзе

Беларусь – адсталая краіна; інтэграцыя – шлях у клуб «нармальных» краін

Пасля інтэграцыі у Беларусі нарэшце будзе парадак






Крыніца: Апошнім часам абмяркоўваецца пытанне аб інтэграцыі Беларусі і Расіі. Скажыце, ці вы згодны ці не згодны з наступнымі выказваннямі?

# ВЫСНОВЫ

- НЕЗАЛЕЖНА АД РОЗНІЦЫ ПОГЛЯДАЎ, НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ — ІСТОТНАЯ КАШТОЎНАСЦЬ ДЛЯ БАЛЬШЫНІ БЕЛАРУСАЎ
- БАЛЬШЫНЯ ЛІЧЫЦЬ, ШТО ДЭМАКРАТЫЧНЫЯ ПРАВЫ НЕ ЗАБЯСПЕЧВАЮЦЦА Ў БЕЛАРУСІ
- ГРАМАДСТВА ЗАСТАЕЦЦА ФРАГМЕНТАВАНЫМ, АЛЕ БЕЛАРУСЫ ГАТОВЫЯ ДА САЛІДАРНАСЦІ І ГРАМАДСКАЙ АКТЫЎНАСЦІ. ІХ СТРЫМЛІВАЕ СТРАХ І ЗНЯВЕРАНАСЦЬ